# *Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў навуковай творчасці выкладчыкаў і студэнтаў*

*М.І. МУШЫНСКІ*

## ЛІТАРАТУРНА-ГРАМАДСКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ЯКУБА КОЛАСА Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Рассматривается литературно-общественная деятельность Я. Коласа периода Великой Отечественной войны, уделяется внимание жанрово-стилевым особенностям его произведений.

Yakub Kolas' literary and public activity is studied. Attention is paid to genre and style peculiarities of his works.

Тэма вайны, яе адлюстраванне ў літаратуры - балючая і разам з тым адказная, бо перад кожным, хто да гэтай тэмы звяртаецца, непазбежна паўстае вялікая ўсенародная трагедыя, драматычныя лёсы мільёнаў, невымерныя людскія пакуты і ўсведамленне свайго доўгу перад памяццю тых, хто аддаў жыццё дзеля ўратавання свету ад фашысцкай навалы. І колькі б не прайшло часу, людзі зноў і зноў будуць вяртацца да векапомных дзён, сведчанняў відавочцаў, дакументальных матэрыялаў, да мастацкага слова, у якім з асаблівай выразнасцю і глыбінёй адлюстравана трагедыя і духоўная веліч народа-змагара.

Сярод беларускіх пісьменнікаў, каму пашчасціла пазбегнуць гібелі ў змрочныя 1930-я гг. і хто з першых дзён Вялікай Айчыннай вайны ўключыўся ў барацьбу з ворагам, быў і Я. Колас. Барацьбу вострым публіцыстычным словам. Трэба сказаць, што гэты перыяд дзейнасці народнага песняра асветлены ўсё ж недастаткова поўна, бо традыцыйна асноўная ўвага надаецца яго класічным творам. Аднак вопыт падрыхтоўкі новага, больш поўнага збору твораў Я. Коласа ў 18, а магчыма і ў 20 або 22 тамах, паказвае, што перыяд ваенных гадоў значна багацейшы, чым раней уяўлялася на падставе існуючага 14-томнага выдання і біяграфічных звестак. Напрыкпад, сярод выяўленых 785 лістоў, якія дапоўняць апублікаваныя 783, многія напісаны ў ваенны час. Тое ж трэба сказаць і пра 250 артыкулаў, якіх няма ў 14-томніку. Вялікую цікавасць уяўляюць і першапачатковыя рэдакцыі, шматлікія варыянты вершаў, паэм, празаічных апавяданняў, створаных у гады вайны. У той жа час згаданыя варыянты, розначытанні дапамагаюць наглядна ўбачыць і тыя цяжкасці, з якімі сутыкнуўся паэт у працэсе мастацкага асэнсавання тэмы чалавека на вайне, у стварэнні вобраза змагара, партызана. А гэта азначае, што працэс асваення беларускай літаратурай ваеннай тэмы, у дадзеным выпадку на індывідуальным вопыце Я. Коласа, больш складаны. Тут багата момантаў, якія пашыраюць нашы ранейшыя ўяўленні аб прадмеце гаворкі.

Вывучэнне мастацкіх твораў Я. Коласа ў сукупнасці з біяграфічнымі матэрыяламі, яго эпісталярнай спадчынай, лістамі да яго П. Броўкі, М. Лынькова, П. Глебкі, С. Гарадзецкага паказала, што ў самых складаных абставінах ваеннага часу пісьменнік працаваў з выкпючнай напружанасцю і ўнутранай самааддачай. І як грамадскі дзеяч, арганізатар навукі, віцэ-прэзідэнт АН БССР, І як паэт, палымяны публіцыст. І асабістая заслуга Я. Коласа перад Бацькаўшчынай, яго ўклад у мастацкае асваенне тэмы вайны таксама істотны. Гэты уклад, улічваючы маштаб таленту народнага песняра І яго тагачасны аўтарытэт у грамадстве, напэўна, мог быць яшчэ больш значным. Але гэтаму не спрыяў шэраг аб'ектыўных фактараў, хоць суб'ектыўны момант таксама прысутнічаў. Гаворка ідзе пра псіхалагічны стан паэта, які перажыў змрочныя часы сталінскіх рэпрэсій, гвалтоўнае знішчэнне шматлікай пісьменніцкай кагорты, арышты блізкіх, сваякоў, марныя спробы аказаць ім дапамогу. Усё гэта, разам узятае, не магло не адбіцца на светаўспрыманні Я. Коласа-паэта, на яго паэтычнай думцы, якая і ў змрочныя часы колішняга турэмнага зняволення, і ў 1920-я гг. творча пульсавала, уздымалася на новыя вышыні, несла веру ў адраджэнне роднага краю.

У канцы ж 1930-х грамадска-палітычныя абставіны зніжалі вольны палёт думкі, прыціскалі долу, штурхалі ў рэчышча афіцыйнай трактоўкі падзей і з'яў. Згаданыя фактары, вядома, пэўным чынам паўплывалі на творчасць Я. Коласа ваеннай пары. Але нас цікавіць перш за ўсё тое, адкуль паэт чэрпаў унутраныя сілы, каб заставацца на ўзроўні свайго вялікага таленту. Не на карысць Я. Коласу як пісьменніку эпічнай скіраванасці было і месца яго жыхарства ў 1941-1943 гг. Але пра гэта - пазней. Грамадска-палітычная, навуковая дзейнасць Я. Коласа ўражвае сваім маштабам і разнастайнасцю:

- рэгулярныя выступленні па радыё са зваротамі і чытаннем вершаў;
- удзел у шматлікіх сходах, мітынгах, накшталт мітынгу прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі;
- удзел у рабоце Усеславянскага камітэта, старшынёй беларускай секцыі якога пісьменнік з'яўляўся доўгі час;
- выступленні з дакладамі на сесіях Прэзідыума АН БССР, віцэ-прэзідэнтам якой Я. Колас быў абраны яшчэ ў даваенныя гады;
- удзел у пасяджэннях сесій Вярхоўнага Савета БССР.

Гэты пералік можна доўжыць і доўжыць, згадваючы яшчэ І

- пасяджэнні пленумаў Камітэта па Дзяржаўных прэміях з ацэнкай твораў па літаратуры;
- работу па перакпадзе гімна СССР на беларускую мову;
- работу па адбору тэкстаў Дзяржаўнага гімна БССР і музыкі да іх;
- падрыхтоўку матэрыялаў для замежных антыфашысцкіх газет, часопісаў, інтэрнацыянальных зборнікаў.

Не лішнім будзе сказаць, што побытавыя ўмовы жыцця і матэрыяльнае становішча сям'і Я. Коласа, асабліва ў першы перыяд жыцця ў Ташкенце, аказаліся даволі складанымі.

І тым не менш пісьменнік немаладога веку з зайздроснай сялянскай цярплівасцю нёс цяжар жыцця ў эвакуацыі, асабістае гора, выкліканае адсутнасцю звестак пра сына, які знаходзіўся на фронце і лёс якога заставаўся невядомы, адарванасць ад роднага краю, ад сяброўскага асяроддзя. Галоўнай справай для Я. Коласа заставалася творчая, пісьменніцкая праца. Што ж характэрна для яго твораў, звернутых да тэмы вайны? Як выявілася тут мастакоўскае светаадчуванне, у чым іх вобразна-змястоўная асаблівасць і жанравая, моўна-стылёвая адметнасць? «Дасылаю свае творы. Няхай што хоча гаворыць аб іх крытык, я ж скажу, што вершы пісаны кроўю сэрца і сокамі нерваў, а таму яны заслугоўваюць таго, каб змясціць іх», - вось якую характарыстыку сваіх твораў знаходзім мы ў лісце Я. Коласа да М. Лынькова ад 4 снежня 1941 г. (13, 251)*. Гэтыя радкі міжвольна прыцягваюць увагу, бо тут адчуваецца прыхаваная нязгода з магчымай стрыманай ацэнкаю з боку газетных работнікаў, ад якіх будзе залежаць публікацыя твораў, прысутнічае і ўсведамленне таго, што мастацкі ўзровень напісанага, магчыма, не зусім адпавядае таленту іх аўтара. Як мы далей убачым, насцярожанасць паэта мела пад сабой пэўныя падставы.

Пераважная частка паэтычнай спадчыны Я. Коласа першых гадоў вайны - творы выразнай грамадзянскай скіраванасці, палымяная публіцыстыка, адкрытае, пафаснае выказванне пачуццяў гневу, абурэння, пагарды да акупантаў. Гэта, бясспрэчна, сацыяльны заказ у дакпадным значэнні слова, і Я. Колас аператыўна яго выконваў. Вершы «Шалёнага пса - на ланцуг!», «Душою і сэрцам мы з вамі, героі», «Фашысцкім бандытам», «На абарону», «Смерць разбойнікаі^», «Абаронцам роднай зямлі», «Народу-барацьбіту», «На звера», «У цяжкую часіну» - яскравыя ўзоры публіцыстычнага жанру з яго заклікальнай, лозунгава-прамоўніцкай інтанацыяй, антыфашысцкай скіраванасцю, пафасам веры ў непазбежнасць перамогі, пачуццём пагарды да здраднікаў.

Аптымістычнае гучанне вершаваных твораў 1941 г., наяўнасць у іх сцвярджэнняў, накшталт «К канцу падыходзіць дарога // Крыві і ярма. // Ад ярасці гневу людского // Збавення няма» (2, 210), тым не менш не перашкаджала паэту праўдзіва маляваць вайну:

" Тут і далей цытаты прыводзяцца па выданні: Колас Я. 36. тв.: У 14 т. Мн., 1972-1978. Далейшыя спасылкі на гэтае выданне (у дужках том і старонка) - у тэксце.

Як пошасць чорная, ўварваўся ён,
Прайшоў разбойніцкай ступою,
І ўсюды кроў, няволю і палон
Пакінуў за сабою.
Спаліў твае сялібы, гарады,
Твой дом разграбіўшы дарэшты.
Не ведаў ты яшчэ такой бяды
З тых дзён, як тут жывеш ты (2, 211).

Як і многія савецкія людзі, выхаваныя ў духу пралетарскага інтэрнацыяналізму, Я. Колас спярша наіўна меркаваў, што вайна можа хутка закончыцца. «Всё будет зависеть от поведения германского народа. А это поведение может круто измениться в конце сентября текущего года», - вось якія разважанні знаходзім мы ў лісце паэта да С. Гарадзецкага ад 17 жніўня 1941 г. Праўда, ён ту жа зрабіў істотнае ўдакладненне: «К сожалению, я располагаю очень скудным фактическим материалом, чтобы делать выводы» (13, 238). Між іншым, выраз пра «скудность» фактычнага матэрыялу выходзіць за межы канкрэтнага пытання і набывае шырокі сэнс.

І ў шэрагу іншых твораў Я. Колас на высокім эмацыянальным уздыме, усхвалявана, з пачуццём болю гаворыць пра невымерныя пакуты безабаронных мірных жыхароў, жытло якіх спалена, набытак знішчаны, разрабаваны. Паэт не паслабляў трагізм народнага лёсу:

Зямля ўся пабіта на тысячы ран,
    Патоптана дзікай ардою.
У грудах абломкаў ляжаць гарады.
    А сёлы - адны папялішчы,
Дзе вецер-вандроўнік пад скогат бяды
    У рэбры будыніны свішча (2, 229).

Пра сілу і глыбіню пачуцця паэта, пра боль яго сэрца ад усведамлення пакут, якія церпіць народ ад бязлітасных акупантаў, яскрава сведчаць і радкі верша «Голас зямлі»:

О, каб я меў такія рукі,
Зямля, абняў бы я цябе,
Каб сцішыць гора твае, мукі
І сілу даць у барацьбе! (2, 218).

Некаторыя вершы будуюцца на адкрытым супастаўленні жыцця ў глыбокім тыле і на акупіраванай Беларусі:

Тут ціха, спакойна, утульна,
І песціцца ў сонцы платан,
І лашчыцца вецер разгульны,
Шырокі, як Узбекістан,
А ў роднай маёй Беларусі
Снуюцца нядоля, бяда,
Пакутуе люд наш у скрусе,
І хлеб яго - сок, лебяда (2, 221).

Бясспрэчна, толькі скпаданыя ўмовы жыцця ваеннага часу маглі спарадзіць у Я. Коласа-паэта вось такія нечаканыя побытавыя ўпадабенні:

Ох, многа там гора, пакуты,
Ды ведай жа, край родны мой:
Няхай буду бедны, разуты,
Абы мне быць толькі з табой (2, 221).

У ранейшых вершах падобныя рэаліі, звязаныя з асабістым матэрыяльным становішчам («Няхай буду бедны, разуты»), здаецца, ніколі не фігуравалі. Відаць, не аднаго галоднага і разутага давялося паэту ўбачыць на ўласныя вочы, каб узнік такі вобраз.

Трэба сказаць, што Я. Колас даволі хутка адчуў пэўную незадаволенасць тым, што выходзіла з-пад яго пяра. Пра гэта яскрава сведчаць варыянты вершаў. Іх, паўтараю, шмат. Бачна, што ўзнятыя тэмы даваліся паэту няпроста, асабліва калі ўзнікпа неабходнасць не толькі выказаць пачуцці пратэсту, але І

даць рэальны малюнак вайны або падзей, што адбываліся на акупіраванай Беларусі. Прычынаю тут была прырода таленту Коласа як пісьменніка эпічнага складу, эпічнага светаўспрымання.

Звернем увагу вось на які момант. У першыя месяцы знаходжання ў Ташкенце Я. Колас адначасова з працай над вершамі пачынае мастацкае асэнсаванне тэмы вайны і ў празаічным жанры. Але даволі хутка адмаўляецца ад сваіх намераў, бо яго спробы (апавяданні «Партизан Купрей», «Сустрэча з ворагам», «У разведцы», «Санітарка Таня») нельга ў творчым плане назваць паспяховымі. Чаму? Адказ відавочны.

Я. Колас належаў да тых мастакоў, натхненне якіх нараджалася пры непасрэдным успрыманні з'яў рэчаіснасці, канкрэтных людзей, іх лёсаў. Я. Колас-пісьменнік павінен быў, так бы мовіць, на ўласныя вочы ўбачыць падзею, якую ён хацеў адлюстраваць у вобразнай форме, убачыць жывых людзей, якія маглі стаць героямі яго твораў, пачуць іх галасы, зафіксаваць у памяці нейкія адметныя жэсты, выразы твару, іх лексіку, інтанацыю, адчуць, зразумець унутраныя матывы ўчынкаў і паводзін. Вядома, і ўбачыць тую паўсядзённую рэальнасць, у якой жылі, працавалі, змагаліся рэальныя людзі, прататыпы яго будучых герояў. Зразумела, што працяглае знаходжанне ў глыбокім тыле пазбаўляла пісьменніка такой магчымасці. Ён вымушаны быў задавальняцца газетнымі паведамленнямі пра ваенныя падзеі, франтавыя эпізоды і становішча на акупіраванай тэрыторыі, інакш кажучы, карыстаўся адфільтраванымі ваеннай цэнзурай звесткамі, фактамі. Адсюль і прыблізнасць малюнку, у якім мала яскравых дэталяў, жывых прыкмет, а дзеючыя асобы часта нагадваюць плакатных герояў.

Адклаўшы працу над празаічнымі творамі на будучае, Я. Колас цалкам засяродзіўся на вершаванай форме. Пры гэтым урокі, якія ён атрымаў як аўтар апавяданняў, у пэўнай ступені былі ўлічаны. Гэта выявілася ў спробах разнастаіць тэмы, матывы вершаў, форму падачы думак, пачуццяў лірычнага героя. І трэба аддаць належнае Я. Коласу. Жанравая палітра яго вершаў, хоць у пераважнай большасці яны належаць да пафаснай публіцыстыкі, даволі разнастайная. Тут мы бачым форму непасрэднага звароту да «абаронцаў роднай зямлі» («Душою і сэрцам мы з вамі, героі»), да «бясстрашных і мужных» «байцоў-камсамольцаў»; форму заклiку («На абарону») «вышэй, ярчэй» узняць молат пометы, праявіць мужнасць:

Дык гуртуй жа магутныя сілы -
Вораг люты штурмуе наш дом.
Ты абруш на яго прах магілы.
Разразіся над ім перуном! (2, 202).

Даволі арганічна ўпісалася ў жанравую сістэму вершаў форма плача, рэквіема над магілай ваяра, які загінуў у няроўным баі, але не парушыў воінскай прысягі, застаўся героем у памяці людской («Над магілай партызана»). Шырока выкарыстоўваў Я. Колас форму так званых народных «кленічаў», праклёнаў-пажаданняў, прадказанняў непазбежнасці адплаты фашыстам за іх злачынствы:

Стой над фрыцавай магілаю,
        Халуй!
Прад табой зямля расступіцца
        Сама,
І, як з вужа, скура злупіцца
        З дзярма...
Будуць, будуць лютым ворагам
        Канцы.
Ой, заплаціце вы дорага,
        Фрыцы! (2, 350).

Нямала знаходзім прыкладаў формы вершаванага памфлета («На восі Рым - Берлін», «Калымага "Рым - Берлін"», «На міжнародныя тэмы» і інш.), а таксама з'едліва-сатырычнай замалёўкі на рэальныя персанажы (Гітлер, яго памагатыя) і абагуленыя - фашыста, фрыца («Пахаванне Гейдрыха», «Дучэ», «Рыцар Шыкпь-грубер»).

Калі ацэньваць вершаваныя творы Я. Коласа ташкенцкага перыяду па вялікім рахунку, дык трэба прызнаць, што якраз у згаданых «кленічах», у сатырычна-выкрывальных вершах найбольш яскрава бачны слабыя бакі яго газетнай публіцыстыкі, бо мастацкі вобраз тут нярэдка падмяняўся шаржам, а пластычны малюнак - плакатам.

Некаторыя вершы як бы спецыяльна напісаны Я. Коласам для сатырычных выданняў, а асобныя строфы можна было выкарыстоўваць у якасці подпісаў пад карыкатурным малюнкам альбо нават як вершаванае настаўленне для партызана, падрыўніка, таго, хто змагаецца на акупіраванай тэрыторыі. Нават назва аднаго вершаванага тэкста «Што трэба?» пацвярджае справядлівасць сказанага. Паэт даваў канкрэтны адказ на пытанне, што трэба рабіць:

Крышы, знішчай, як можаш, ваўчуру,
Начыненую ядам,
Агнём палі прасмердлую нару,
Дыхнуць не дай ім, гадам.
Труці іх, распінай, бі з-за вугла
Даўбнёй, нажом, сякерай,
Каб галавы падняць больш не магла
Фашысцкая халера (2, 236).

Сярод твораў Я. Коласа ваеннай пары, і гэта хацелася б асабліва падкрэсліць, прыкметна вылучаецца шэраг вершаў, звернутых непасрэдна да лёсу роднай Бацькаўшчыны: «Лес», «Развітанне», «У цяжкую часіну», «Голас зямлі», «Вясною», «Стары гасцінец», «На захад», «Мая зямля». Яны пазбаўлены публіцыстычнай завостранасці, у іх больш цеплыні, жывых нацыянальных рэалій, няхай і ўзноўленых па памяці. Паэт дакладна ўлічвае характар светаўспрымання свайго адрасата.

І пейзажная лірыка, дзе Я. Колас-мастак заўжды адчуваў сябе ўпэўнена, пасляхова выкарыстоўваецца ім, каб у новым ракурсе раскрыць тэму народнай барацьбы. Так, у вершы «Лес» няма баявых эпізодаў, бой партызанаў з ворагам яшчэ толькі рыхтуецца, але паэту ўдалося перадаць трывожную напружанасць: старажытны бор - таксама змагар, гэта жывая істота, гатовая прыйсці на дапамогу тым, хто абараняе Айчыну («З-пад камлёў замшэлых, // З-пад балот, палян // Сочыць вокам смелых, грозных партызан». 2, 200).

А ў вершы «Голас зямлі» Я. Колас узняўся да глыбокіх абагульненняў, ён сам-насам гаворыць з беларускай зямлёй, чуе яе прызыўны голас, у якім зліліся «І шум дубровы І стогн пушчы, // І рэк усхліп, і плач крыніц». Голас маці-зямлі зрабіў паэта па-сапраўднаму відушчым, дапамог убачыць тое, што адбываецца ў родным краі:

Я бачу постаці тэўтонаў -
Халодны твар, звярыны від.
Не знае жалю, ні законаў
У сталь закованы капыт (2, 218).

Абагулены вобраз ворага, створаны рэалістычнымі сродкамі, уражвае больш, чым шаржыраваны малюнак з азначэннямі выкрывальнага характару: «зладзейскі бандыт», «фашысцкая падпюга», «пруская паскуда», «зверы-жываглоты» і інш.

Імкнучыся актуалізаваць праблематыку вершаў, надаць ім моцнае сэнсава-змястоўнае гучанне, зрабіць болей маштабнай думку, якую нясе верш, Я. Колас істотна абнаўляў вобразна-выяўленчыя сродкі гэтых твораў. Так, напрыклад, ён стаў шырока выкарыстоўваць гістарычныя аналогіі, паралелі, сэнс якіх у выкрыцці беспадстаўных спробаў фюрэра стаць побач з вядомымі гістарычнымі асобамі: «І Цэзара лаўры ён сніць». Саюзнік Мусаліні пераконвае Гітлера ў яго велічы: «Мой слаўны фюрэр! Веру, веру, // Бо ты ж другі Напалеон!» (2, 385). На што Гітлер, як бы прадчуваючы сваю бясслаўную будучыню, з раздражненнем і злосцю адказвае:

Не каркай, дучэ, як варона,
Не варушы сатлелы прах,
Бо мне імя Напалеона
Варожыць лёс яго І шлях (2, 385).

Згадваюцца і іншыя вядомыя гістарычныя імёны:

Я чую, робяць людзі труны,
Куюць ланцуг на калігул (2, 183).

Ахвотна ўжывае аўтар выкрывальных сатырычных вершаў азначэнні негатыўна-ацэначнага характару, таксама звязаныя з гістарычнай мінуўшчынай, з дзейнасцю агрэсіўных плямёнаў-заваёўнікаў: «дзікая арда», «дзікія гуны», «тэўтонская арда» I г. д.

Актыўна выкарыстоўваў Я. Колас фальклорную вобразнасць, элементы фантастычных казак пры апісанні варожых сіл: «фашысцкаму змею тут будзе магіла», «варожыя раці вампіраў заклятых», «і курчыцца ў болях прыдушаны змей»; «ў Маскву ўставіўся вампір»; «гадавай атрутай сам ён, гад, умыты - кроўю чорнай, злой»; «як пашасць чорная»; «фашысцкая пачвара» і інш.

Не цураўся паэт і біблейскай лексікі там, дзе гэта дыктавалася логікай развіцця мастацкай думкі: «крывавае цьмы пасланец»; «сіла цьмы», «пасланнік ліхаты»; «сыноў жа цьмы аторне цьма», «каінаў труп».

Або:

У глыбінях цёмнай далі
Цішыня, спакой.
Чым запоўняцца скрыжалі
І чыёй рукой (2, 217).

Нельга не звярнуць увагу I на тое, як эфектыўна працуюць на сэнсавае ўзбагачэнне паэтычнага радка ўжытыя Я. Коласам шырока вядомыя крылатыя выразы фальклорнага або літаратурнага паходжання. «Той мусіць загінуць, хто меч узнімае» (2, 180). Адразу згадваюцца словы Аляксандра Неўскага: «Кто с мечом к нам придет, от меча и погибнет». Афарыстычнае выслоўе-заклік - «Перекуем мечи на орала!» - адпаведна патрабаванням часу трансфармуецца: «Народы... На меч перакуйце ваш плуг...» (2, 180). Іншыя прыклады: «За морам цялушка-палушка, // Ды дораг яе перавоз»; «Хоць бачыць бандыцкае вока, // Ды воўчыя зубы не ймуць», 2, 195). Увогуле вусна-паэтычныя і літаратурныя рэмінісцэнцыі - адна са стылёвых прыкмет паэзіі Я. Коласа ваенных гадоў.

Калі чытаеш радкі «Як салодак мне родных хатак дым, // Араматы лясоў нашых, нівы» (2, 184), адразу ж згадваюцца словы Чацкага са славутай камедыі А.С. Грыбаедава «Гора ад розуму»: «И дым отечества нам сладок и приятен». А горкаўскае «Рожденный ползать - летать не может» выкарыстана беларускім паэтам, каб яскравей падкрэсліць марнасць надзей захопнікаў на перамогу:

Чарвяк не ўзлятае ў нябёсы,
Бо слеп і без крыл (2, 200).

У вершах ташкенцкага перыяду багата прастамоўных выразаў, зніжанай пабытавай лексікі, вульгарызмаў, нават натуралістычных дэталяў. Вядома, сатырычны жанр, устаноўка на выкрыццё адмоўных персанажаў як носьбітаў зла, на іх высмейванне, маральную дыскрэдытацыю дазваляла пісьменніку выкарыстоўваць падобныя сродкі. Мной скпадзены невялікі даволі цікавы ў змястоўным плане слоўнічак азначэнняў паводле вершаваных твораў ваеннай пары. З аднаго боку, трэба аддаць належнае паэту ў яго імкненні да лексічнай разнастайнасці пры вызначэнні аблічча ворага, напрыкпад: «Драпежны звер аскаліў зубы, // А побач з ім брыдзе шкілет», «зграя псоў чужых», «фашысцкі людаед», «вылюдак Гітлер», «фашысцкі звер», «чужынцы», «фашысцкая пята», «чорныя душы», «ліхадзей», «псы-душагубы», «подлыя каты, як іхнія Кубэ», «фашысцкая тля», «фашысцкі люты кат», «Кубэ Вільгельм - кат, тупіца», «прагная саранча», «чужынец-гад», «Гітлер-кат», «фашыст-паскуда», «нямецкі звярынец», «вораг заклятьі» I ІНШ.

З другога ж боку, у пісьменніцкіх ацэнках, характарыстыках нельга не бачыць, так бы мовіць, пэўнага перабору, калі некаторыя азначэнні рызыкуюць аказацца па-за эстэтычнымі крытэрыямі, дзе пачуццё мастацкай меры парушана: «фашысцкая чорная вош», «нядоўга сваволіць расцугленай сцерве», «цешся, падла тупарылая, лютуй».

Моўна-выяўленчы «перабор» у канчатковым выніку абумоўлены адсутнасцю неабходных паэту жывых, канкрэтных назіранняў, а таксама I вымушанай зву-

жанасцю тэматыкі, бо яна дыктавалася канкрэтнымі абставінамі часу. Адным з эфектыўных сродкаў, з дапамогаю якіх Я. Колас спрабаваў выйсці за межы гэтай звужанасці, надаць вершам разнастайнасць, сталі пошукі ў галіне формы. Сапраўды, рытмічны лад, строфіка, рыфма ў творах Я. Коласа ваеннай пары надзвычай багатыя. Можна толькі здзіўляцца вынаходлівасці паэта ў пабудове страфы: ёсць страфы 2-, 4- і 6-радковыя, ёсць рыфма парная, апаясваючая, перакрыжаваная. Выключна высокае майстэрства гукапісу. Вядома, не кожны верш дасягаў узроўню паўнавартаснай грамадзянскай паэзіі, бо аголеная публіцыстыка часам выцясняла паэтычную думку, але ў фармальнай апрацаванасці нават і такім вершам адмовіць нельга.

Зварот Я. Коласа да звыкпай яму жанравай формы ліра-эпічнай паэмы таксама быў яшчэ адной спробай вырвацца з публіцыстычнага кола і стварыць болей маштабны, болей яскравы і болей дасканалы ў мастацкіх адносінах вобраз Беларусі, якая змагаецца з ворагам. Аўтар паэм «Суд у лесе» (1942) і «Адплата» (1943-1944) імкнуўся ўславіць гераізм народа, паказаць скпаданасць умоў, у якіх дзейнічалі партызаны. І пэўных поспехаў, безумоўна, дасягнуў, асабліва ў «Адплаце», дзе шмат змястоўных, эмацыйна насычаных фрагментаў, лірычных адступленняў, цудоўных пейзажных замалёвак. Ёсць і спроба мастацкага даследавання вострай маральна-этычнай праблемы - лёсу людзей, якія сілаю абставін вымушаны былі супрацоўнічаць з акупантамі. Так, пра хістанні, разгубленасць Цімоха ідзе ў паэме сур'ёзная размова. Аднак і гэтаму твору часта шкодзіць прыблізнасць у абмалёўцы эпізодаў партызанскай барацьбы, павярхоўны падыход да раскрыцця ўнутранага свету дзеючых асоб («Хоць жа, праўда, быў зроблен удала // На чыгунку паход і напад - // Накасілі фашыстаў не мала, // А вярнуліся самі без страт». 2, 354).

Не змяншаючы мастацкую вартасць і грамадска-патрыятычнае значэнне вершаў і паэм Я. Коласа, прысвечаных падзеям вайны, трэба, аднак, прызнаць, што найбольш выразна праявіўся талент паэта ў перыяд ваенных гадоў праз філасофскую, пейзажную і інтымную лірыку. Гэта перш за ўсё вершы, прасякнутыя глыбокім роздумам аб сэнсе жыцця, яго хуткаплыннасці, прызначэнні чалавека і складанасці чалавечай натуры («Сыну», «Чымган», «Міхасю», «Невядомы хлопчык», «Вузкае», «Вандроўнікі», «С. Г.» і інш.). Асаблівым жа хараством вылучаюцца вершаваныя пасланні да Марыі Дзмітрыеўны І да паэтэсы-перакладчыцы Святланы Сомавай. У лірыцы асабістых перажыванняў Я. Колас знайшоў сябе, ранейшага, якім быў у лепшыя часы 1910-1920-х гг., надзвычай плённых, прадуктыўных. Паколькі прыватнае жыццё савецкага пісьменніка, сфера яго інтымных пачуццяў на працягу многіх і многіх гадоў не лічылася вартай увагі, дык не трэба здзіўляцца таму, што ніводны верш, прысвечаны Сомавай, пры жыцці Я. Коласа не быў апублікаваны. А гэта азначае, што такія па-мастацку дасканалыя, глыбока паэтычныя творы, як «У бяссонную ноч», «На развітанне», «І неба хмурна пазірае», «Святлане», «Арол», «Зорка», «Адступілася радасць мая ад мяне», «Крынічка», «Мая просьба», «У змярканне», «Бывае музыка і ў стуку» і інш., не трапілі ў 7-томны збор твораў (1952), а сталі вядомы толькі ў 1960-я гг. Значэнне ж гэтых вершаў для Я. Коласа як паэта аграмаднейшае: яны разняволілі песняра, далі магчымасць выказваць тое, чым жыла душа, што хацелася сказаць без аглядкі на рэдактара ці цэнзара. Тут паэт раскрыўся як неардынарная асоба з выразна акрэсленымі маральна-этычнымі прынцыпамі, з высакародным стаўленнем да жанчыны. У выяўленні асабістых пачуццяў Я. Колас стрыманы, далікатны, тактоўны, пачуцці яго глыбокія, шчырыя. Узаемаадносіны з той, што ўвасабляе красу і прыгажосць, і ў рэальным жыцці былі скпаданыя, напоўненыя драматызмам, таму і лірычны герой вершаў усведамляе немагчымасць адолець перашкоды, якія паўсталі на яго шляху:

> Бо не прайду я тую сцену,
> Што засланіла мае дні.
> І знаю я, што больш не стрэну
> Сугучнай сэрцу цеплыні (2, 403).

Матыў адзіноцтва, непадзельнага кахання - асноўны ў вершах, адрасаваных Сомавай, «светлай зорцы», якая сваім існаваннем несла радасць, абуджала прагу да жыцця, натхняла да творчасці.

Вершаваныя пасланні Я. Коласа да Марыі Дзмітрыеўны таксама надзвычай багатыя паводле сэнсава-эмацыйнай напоўненасці. Тут інтымныя пачуцці паэта цесна пераплецены з разнастайнымі аспектамі грамадскага жыцця. І гэта таксама паэзія высокага ўзору. І таксама вялікае дасягненне беларускага прыгожага пісьменства, адна з яе яскравых старонак, запоўненая рукою выдатнага майстра слова, нацыянальнага класіка.

Паступіў у рэдакцыю 05.04.05.

*Міхаіл Іосіфавіч Мушынскі* - член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар філалагічных навук, прафесар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Я. Коласа, галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Я. Купалы НАН Беларусі.

*Дз.Ч. ПАШКЕВІЧ, І.А. ЧАРОТА*

# АДЛЮСТРАВАННЕ ГЕРАІЧНА-ТРАГІЧНАГА ВОПЫТУ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ І СЕРБСКАЙ ПРОЗЕ (на прыкладзе твораў Васіля Быкава і Міхайлы Лаліча)

Предложен сравнительный анализ отражения героического и трагического опыта Второй мировой войны в белорусской и сербской прозе на примере произведений Василя Быкова и Михайло Лалича.

Your attention is called to the comparative analysis of the reflection of the heroic-tragic experience of World War II in the works by Vasil Bykav and Mikhailo Lalich.

Як у беларускай, так і ў сербскай літаратуры другой паловы XX ст. асаблівую значнасць І знакавасць набыла ваенная тэматыка. Гэта заканамерна і абумоўлена асаблівасцю гістарычных выпрабаванняў, якія выпалі на долю нашых народаў у часы Другой сусветнай вайны. І беларусы і сербы вялі супраць акупантаў жорсткую барацьбу, якая ўражвала мужнасцю і адначасова вялікімі ахвярамі.

Акрамя падабенства ваенных лёсаў сербаў і беларусаў, існуе шмат адрозненняў, якія неабходна ўлічваць: 1941-1945 гг. для сербаў час не толькі нямецка-фашысцкай акупацыі, але і генацыду з боку былых суграмадзян, усташаў, а таксама грамадзянскай братазабойчай вайны паміж сіламі Югаслаўскага войска на чале з генералам Дражам Міхайлавічам і камуністычна-партызанскага руху на чале з Іосіпам Броз-Ціта. Перамога над фашызмам прынесла збаўленне не толькі ад знешняга ворага, але і ад каралеўскай улады. Была ўтворана новая федэратыўная дзяржава, і пачалося будаўніцтва сацыялізму. Аднак у далейшым шматлікія супярэчнасці прывялі да жорсткага канфлікта Югаславіі з СССР.

Тыпалагічна падобнае праяўлялася ў самасвядомасці і псіхалогіі народаў, якія вялі барацьбу з фашызмам і сталі пераможцамі. Пры гэтым нельга не звярнуць увагу на прысутнасць у светаадчуванні сербаў трагізму, таго, што можа быць названа «косаўскім архетыпам» - тымі праявамі свядомасці, якія звязаны з Косаўскай бітвай 1389 г. і яе вынікам - пяцісотгадовым турэцкім прыгнётам.

Мелася, акрамя таго, і свая спецыфіка ў развіцці літаратур. Сербскія пісьменнікі, як і іншыя югаслаўянскія, не адчулі моцнай залежнасці ад нарматыўна-дагматычных установак сацрэалізму і пры ўсіх супярэчнасцях аддавалі перавагу аналітызму і крытыцызму, што істотна адбілася на ўвасабленні тэмы вайны. У беларускай, як і ва ўсёй савецкай літаратуры, падобнае пачало заўважацца хіба што ў 1960-я гг.

Між тым, каб выявіць агульнае, паспрабуем супаставіць творы ваеннай тэматыкі вядомага беларускага пісьменніка Васіля Быкава і не меней вядомага сербскага празаіка Міхайлы Лаліча.

Абгрунтоўваючы правамернасць такога супастаўлення, можна было б зноўтакі паразважаць пра гістарычныя, палітычныя і культурныя ўмовы таго часу, у якіх жылі і працавалі гэтыя пісьменнікі, падкрэсліць падабенства іх лёсаў, звярнуць увагу на аналагічныя ролі ў культурным і грамадскім жыцці сваіх краін, на прызнанне іх твораў за межамі айчыны, прыгадаць асабістыя кантакты. Але мы не будзем падрабязна спыняцца на гэтым, а паспрабуем высветліць іх ідэйна-эстэтычныя пазіцыі, асаблівасці бачання і разумения вайны ўвогуле, вызна-